# Голас душы

Яднанне ў любові

№ 9-10 (544)
Субота, 21 кастрычніка 2017 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь


## «МЫ ПАВІННЫ ЎВАСКРАСІЦЬ ЗАНЯДБАНУЮ ДУШУ ЕЎРАПЕЙЦА»

*У касцёле Св. Сымона і Св. Алены – адной з вялікіх святыняў Мінска – 28 верасня 2017 г. з цяжкасцю змясціліся жадаючыя памаліцца разам з іерархамі з усёй Еўропы. Біскупы прыбылі ў беларускую сталіцу на асамблею Рады Канферэнцый Біскупаў Еўропы*



45 старшыняў біскупскіх канферэнцый Еўропы, іерархі і святары Беларусі ва ўрачыстых залатых арнатах прайшлі вялікай працэсіяй да алтара. Галоўны цэлебрант – прэфект Кангрэгацыі па справах Біскупаў кардынал Марк Уэлле, Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч і некаторыя іерархі засталіся ў прэзбітэрыі, а большасць пастыраў заняла месцы ў касцёле.

Звяртаючыся да прысутных біскупаў, кардынал Уэлле адзначыў: «Сёння мы сабраліся, каб зрабіць свой пастырскі ўнёсак, каб магло адрадзіцца духоўнае вымярэнне, якое некалі было фундаментам Еўропы».

Па словах канадскага іерарха, адным з апорных слупоў, які абагачаў еўрапейскую самасвядомасць, была Біблія, але ў сённяшнім лібералізаваным і секулярызаваным свеце яна забытая. «Агульная сям’я Касцёла цяпер выглядае пакінутай», – дадаў кардынал Уэлле, падкрэсліўшы, што пануючая сёння культура ўжо не з’яўляецца хрысціянскай, але матэрыяльнай і непадатлівай да новай евангелізацыі.

Па словах кардынала Уэлле, у многіх сучаснікаў жаданне пазнаць Езуса звязана не са шчырым прагненнем навяртання, а часта са звычайнай цікаўнасцю або з жаданнем мець уладу.

*Працяг на стар. 2*

# «МЫ ПАВІННЫ ЎВАСКРАСІЦЬ ЗАНЯДБАНУЮ ДУШУ ЕЎРАПЕЙЦА»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Толькі абвяшчаючы Збаўцу, як дадаў іерарх, можна адбудаваць супольны дом, якім з'яўляецца Еўропа.

«Калі мы жадаем, каб у новага пакалення была будучыня, мы павінны забяспечыць ім не толькі працоўныя месцы, але і асяроддзе, у якім будзе панаваць узаемная пашана і салідарнасць», – падкрэсліў канадскі кардынал.

Галоўны цэлебрант нагадаў таксама, што кожная добрая справа нараджаецца са слухання Святога Духа. «Трэба ўвайсці ў цішыню (…) і пачуць голас Бога, каб кожнае нашае слова стала прыладай Бога», – адзначыў кардынал Уэлле, кажучы пра пільную неабходнасць «уваскрасіць занядбаную душу еўрапейца».

«Адновім нашую руплівасць у душпастырскай працы з дапамогай моладзі і сем'яў», – заклікаў кардынал Уэлле і дадаў, што, выходзячы да пакінутых і патрабуючых, да тых, хто жыве па-за грамадствам, можна даваць праўдзівае сведчанне сваёй веры і прысутнасці міласэрнага Бога ў Касцёле, а такім чынам і аднаўляць супольны дом, якім з'яўляецца Еўропа.

Адна з тэм асамблеі РКБЕ датычыць моладзі. З гэтай нагоды на заканчэнне святой Імшы ў Чырвоным касцёле прагучалі сведчанні маладой дзяўчыны і юнака пра іх навяртанне, пазнанне Бога і адкрыццё сябе нанова праз прызму веры.

*Валянціна Грамыка*
*Паводле Catholic.by*














# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З КАТАЛІЦКІМІ БІСКУПАМІ ЕЎРОПЫ

*28 верасня 2017 г. у Палацы Незалежнасці Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка сустрэў каталіцкіх біскупаў 45 краін Еўропы, якія прыбылі ў Мінск на пленарнае пасяджэнне Рады Канферэнцый Біскупаў Еўропы*

Падчас сустрэчы з каталіцкімі іерархамі прэзідэнт адзначыў, што прыезд у Мінск такіх высокіх прадстаўнікоў каталіцкага духавенства расцэньваецца «як знак асаблівай павагі да веруючых католікаў Беларусі».

«Упэўнены, гэта прызнанне палітыкі міру і згоды, якую наша дзяржава ўпэўнена праводзіць унутры краіны і на міжнароднай арэне», – падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што пасяджэнне біскупскіх канферэнцый Еўропы ў многім сімвалічнае. У гэтым годзе Беларусь святкуе 500-годдзе выдання першай друкаванай кнігі на старабеларускай мове. Акрамя гэтага, сёлета прыпадае 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Святым Пасадам.

«Упэўнены, наша супрацоўніцтва з Каталіцкім Касцёлам будзе і далей плённа развівацца на дабрабыт міру і тварэння», – зазначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Існуючая ў нас сістэма неканфліктных адносін паміж дзяржавай, рэлігіяй і грамадствам можа і павінна быць прыкладам для іншых краін. Вашая Рада – гэта прыклад таго, што Царква, як заўсёды, паказвае прыклад, якім шляхам трэба ісці, каб наблізіцца да вырашэння тых складаных застарэлых і новых канфліктаў, якія ёсць сёння ў свеце. І тым больш важкім становіцца статус нашага Мінска, як важнай пляцоўкі для перамоў, на якой абмяркоўваюцца і прымаюцца рэзалюцыі па самых цяжкіх рэгіянальных і сусветных праблемах».

*Аляксандр Лукашэнка: «Рэлігійныя канфесіі могуць і абавязаны адыграць важную ролю ва ўрэгуляванні канфліктаў».*

Паводле слоў беларускага лідара, у Беларусі спакойна суіснуюць прадстаўнікі розных рэлігій і нацыянальнасцяў.

«Мы гэта цэнім, і вашае пасяджэнне тут абавязвае нас да яшчэ большай адказнасці ў плане адзінства нацыянальнасцяў і рэлігій», – сказаў прэзідэнт.

«Мы робім і працягнем рабіць усё магчымае, каб Мінскія дамоўленасці, якім няма альтэрнатывы, садзейнічалі хутчэйшаму ўстанаўленню міру на ўкраінскай зямлі, – падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. – Я перакананы, што важную ролю ва ўрэгуляванні канфліктаў, пабудовае дыялогу паміж рознымі народамі і дзяржавамі ў аб'яднанні людзей могуць і абавязаны адыграць рэлігійныя канфесіі.

*Працяг на стар. 4*



# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З КАТАЛІЦКІМІ БІСКУПАМІ ЕЎРОПЫ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 3*

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павел у сваю чаргу падкрэсліў, што «беларускі народ ведае цану міру не пачутках».

«Міралюбівы настрой беларускага народа базуецца на асабістым досведзе перажытых выпрабаванняў, якія выпалі на лёс нашых продкаў у мінулыя стагоддзі, – дадаў праваслаўны іерарх, прыгадваючы перажытыя нашым народам войны, міжрэлігійныя канфлікты і іншыя канфліктныя настроі. – Мы шчыра жадаем, каб яны больш ніколі не паўтараліся ў будучыні».

Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павел выказаў «надзею на тое, што праца гэтай канферэнцыі будзе спрыяць міру і добрасуседству на ўсёй прасторы Еўропы».

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, звяртаючыся да прэзідэнта і прысутных каталіцкіх біскупаў, агучыў ключавыя тэмы асамблеі – моладзь і Еўропа як супольны дом. Беларускі іерарх падкрэсліў, што сёння «Еўропа перажывае шмат выпрабаванняў», а галоўнай прычынай яе заняпаду з’яўляецца духоўны крызіс.

Мітрапаліт Кандрусевіч таксама выказаў надзею, што высокі форум «дасць новы імпульс для ўдасканалення ўзаемаадносін паміж дзяржавай і Касцёлам, а таксама для папулярызацыі Беларусі ў Еўропе і свеце, каб наша краіна была вядома ў ім перадусім як краіна Божага духу».



Кардынал Анджэло Баньяска ў звароце да прэзідэнта адзначыў, што «Касцёл, верны сваёй місіі, жадае зрабіць свой станоўчы ўнёсак у супольнае дабро, і мы перакананыя ў такой самай увазе і такім жа разуменні з боку кожнага ўраду і кожнай дзяржавы, у якой ён існуе».

Ватыканскі іерарх ухваліў увагу ўраду Беларусі «да сям’і, што праяўляецца ў захадах, скіраваных на павелічэнне нараджальнасці». «Гэта знак надзеі ў Еўропе, дзе назіраецца трывожны спад нараджэнняў, што суправаджаецца старэннем насельніцтва», – падкрэсліў кардынал Баньяска.



«Мы таксама высока ацэньваем працу і дыялог, якія дзяржаўныя ўлады вядуць з рознымі хрысціянскімі Цэрквамі краіны. У гэтай атмасферы добрага супрацоўніцтва мы ўпэўненыя, што пытанні адносна дазволу на пражыванне і працу для замежных святароў і адносна касцёльнай маёмасці – а яны абодва жыццёва важныя для місіі евангелізацыі – могуць быць вырашаны ў эфектыўным і актуальным дыялогу з удзелам усіх», – дадаў старшыня РКБЕ.



*Ілья Лапато, Валянціна Грамыка*
*Паводле Catholic.by*

# «МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ ШУКАЕ БОГА ПРАЗ ВЕДЫ»

*30 верасня 2017 г., у апошні дзень пленарнага пасяджэння Рады Канферэнцый Біскупаў Еўропы ў Мінску, прэс-пул сустрэўся з біскупамі Беларусі, якія сёлета з'яўляюцца гаспадарамі асамблеі*

Беларускі епіскапат на чале з Мітрапалітам Тадэвушам Кандрусевічам на пасяджэнні РКБЕ прадстаўлялі біскуп Віцебскі Алег Буткевіч і дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Юрый Касабуцкі. У асамблеі ўдзельнічалі таксама дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Аляксандр Яшэўскі SDB і біскуп Пінскі Антоні Дзям'янка.

**Моладзь Беларусі. Якая яна?**

Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч, адказваючы на пытанні журналістаў, нагадаў, наколькі важным з'яўляецца ў жыцці чалавека духоўнае жыццё.

«Моладзь – тая частка грамадства, якая з'яўляецца будучыняй. Таму Касцёл звяртае на яе асаблівую ўвагу, – падкрэсліў біскуп Віцебскі Алег Буткевіч. – Час маладосці – гэта час, калі малады чалавек знаходзіцца ў пошуку свайго месца ў грамадстве, час разважанняў пра сэнс жыцця. Адказаць на гэтыя пытанні ўласцівым чынам можна толькі маючы ўпарадкаванае духоўнае жыццё».

Моладзь у Беларусі, як дадаў іерарх, «адкрытая на духоўную сферу і на тую духоўнасць, якую прапануе хрысціянская вера і ў асаблівасці Каталіцкі Касцёл». «Перад Касцёлам сёння стаіць заданне – выкарыстаць гэтую магчымасць і дапамагчы маладому чалавеку адказаць на хвалюючыя пытанні», – адзначыў біскуп Віцебскі.

Як дапоўніў біскуп Юрый Касабуцкі, «моладзь сапраўды адкрытая на веру, на Бога, аднак у той жа час яна знаходзіцца пад уплывам абсалютна розных тэндэнцый і розных магчымасцяў». «Касцёл прыкладае шматлікія намаганні, каб перадаць моладзі хрысціянскія каштоўнасці. Гэта і акцыі, якія праводзяцца з моладдзю, і праца пры парафіі, дзе арганізоўваюцца моладзевыя сустрэчы – так званы касцяк, які можа несці Бога ў свае асяроддзі і прыцягваць іншых маладых людзей у Касцёл», – сказаў біскуп Касабуцкі.

Беларускія іерархі таксама ўказалі на вялікую зацікаўленасць беларускай моладзі ў паглыбленні сваіх ведаў адносна праўдаў веры. І на гэта Касцёл даў свой адказ: тэалагічны каледж, заснаваны ў Мінску найперш для падрыхтоўкі катэхетаў, з цягам часу адчыніў свае дзверы таксама для тых, хто жадае набываць больш глыбокія веды па тэалогіі дзеля паглыблення сваёй веры.

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, у сваю чаргу, адзначыў, што моладзь Беларусі, як і моладзь свету, хоча чуць пра Бога на зразумелай для яе мове. На думку Мітрапаліта, варта «рабіць ухіл на сям'ю, якая адыгрывае важную ролю ў сучасным свеце. «Сям'я дае пачатак усяму. У перыяд Савецкага Саюза – няпросты час атэізму – вера перадавалася ад аднаго пакалення да іншага», – падкрэсліў іерарх.

**Ці гатовы Касцёл слухаць моладзь?**

«Суадносіны паміж Богам і людзьмі найлепш будуюцца ў форме дыялогу, калі зварот узаемны. Касцёл у Беларусі стараецца гэтаму спрыяць, – сказаў біскуп Буткевіч. – Касцёл у Беларусі яшчэ выходзіць з часоў атэізму, які пакінуў у душах людзей вялікую пустэчу і прывёў да адсутнасці рэлігійных і тэалагічных ведаў. Таму сёння задача Касцёла – даць гэтыя веды, запоўніць прабел, які ўзнік у часы атэізму, а таксама перадаць хрысціянскія традыцыі, якія моладзь не мела магчымасці вынесці са сваёй сям'і».

Віцебскі ардынарый нагадаў пра шматлікія акцыі для моладзі, якія Касцёл арганізоўвае з мэтай даць адказы на пытанні юнакоў і дзяўчат, а таксама пра арганізацыю выездаў беларускай моладзі за мяжу, каб у іншых рэаліях і побач з маладымі людзьмі іншых краін шукаць адказы на свае пытанні.

Адным са значных моладзевых каталіцкіх форумаў у Беларусі біскуп Касабуцкі назваў сустрэчы, якія арганізоўваюцца штогод у Івянцы, якія ў гады правядзення Сусветных дзён моладзі са Святым Айцом сугучныя з імі. Падчас такіх сустрэч, як адзначыў іерарх, моладзь выказваецца пра тое, якім яна бачыць Касцёл, якім яна бачыць сваё месца і місію ў ім.

Менавіта моладзь, як дадаў біскуп Касабуцкі, выказалася пра магчымасць выкарыстання сацыяльных сетак з мэтай распаўсюджвання хрысціянскіх каштоўнасцяў. Таксама менавіта на гэтых сустрэчах моладзь данесла да сваіх пастыраў важную думку: для таго, каб яны прысутнічалі ў Касцёле і дзейнічалі ў ім, важна, каб побач з імі хтосьці быў – святар ці манахіня.

**У чым мае патрэбу Касцёл у Беларусі сёння?**

«Касцёлу ў Беларусі, як і Касцёлу ў свеце, сёння патрэбна святасць тых, хто пакліканы да Божай службы, – святасць святароў, якія з'яўляюцца слугамі Езуса Хрыста. На гэтым будуецца і пастырскае жыццё, і развіццё Касцёла», – сцвердзіў біскуп Алег Буткевіч.

Біскуп Касабуцкі, у сваю чаргу, указаў на недахоп святароў, хоць колькасць пакліканняў да святарства і кансэкраванага жыцця ў Касцёле ў Беларусі значна ўзрасла.

Кажучы пра недахоп сакральных будынкаў у краіне, іерархі выказалі ўдзячнасць Касцёлу ў краінах Еўропы за дапамогу ў адбудове разбураных беларускіх святыняў у часы ліхалеццяў і ў будаўніцтве новых. «Без гэтай дапамогі такое хуткае адраджэнне не было б магчыма», – падкрэсліў біскуп Віцебскі.

*Паводле Catholic.by*

# ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЛАННЕ РАДЫ КАНФЕРЭНЦЫЙ БІСКУПАЎ ЕЎРОПЫ

*30 верасня, Мінск, касцёл Найсвяцейшай Тройцы (св. Роха) на Залатой Горцы*

Касцёл любіць Еўропу і верыць у яе будучыню: Еўропа – гэта не толькі пэўная зямля, а духоўнае заданне. На пленарным пасяджэнні, якое прайшло ў Беларусі, у Мінску, мы пацвердзілі свой абавязак з энтузіязмам удзельнічаць у шляху кантынента, які мае штосьці вялікае, чым можа падзяліцца з усімі ў парадку ўзаемасувязі.

Заданне нашай Рады ў тым, каб развіваць лучнасць паміж пастырамі ў розных краінах і знаходзіць шляхі, каб голас Пана Езуса зноў загучаў у сэрцы «еўрапейскага чалавека», культуры і грамадства: годнасць чалавечай асобы дзе ж яшчэ можа знайсці для сябе больш надзейную апору, калі не ў Езусе Хрысце, Сыне Божым, які стаўся чалавекам? Гэта – унікальны ўнёсак хрысціянства ў еўрапейскую тоеснасць, і два тысячагоддзі міласэрнасці, мастацтва, культуры з'яўляюцца жывым таго сведчаннем.

З найлепшымі пачуццямі мы далучаемся да пажадання Святога Айца Францішка «новага і адважнага ўздыму для гэтага ўзлюбленага кантыненту». Мы не можам застацца ў баку ад гэтага ўздыму, усведамляючы, што з'яўляемся пасланцамі радаснай навіны. Пасланне, за якое мы нясём адказнасць перад светам, узнёслае і магутнае, але мае слабыя прылады. Хрыстова Евангелле – гэта спрадвечная крыніца гісторыі Еўропы, яе гуманнай цывілізацыі, дэмакратыі, правоў і абавязкаў чалавека. Гэта таксама іх найбольш надзейная гарантыя!

Нягледзячы на штуршкі, якія намагаюцца ізаляваць, мы верым у гэтае адзінства духоўных і этычных ідэалаў, якія заўсёды з'яўляюцца душою і лёсам Еўропы. Таксама, як мы верым і ў няспынны шлях паяднання, які з'яўляецца часткай не толькі гісторыі, але і жыцця, які вядзе да павагі і да належнага прызнання розных традыцый і рэлігій без аніякага экстрэмізму.

Адкрытасць для рэлігіі, для трансцэндэнтнага, для салідарных узаемаадносінаў, для еднасці, атрымала свой канкрэтны выгляд у Евангеллі і паказала ўнікальную годнасць асобы; натхняла не заўсёды просты шлях Еўропы, на якім былі таксама абмежаванні і памылкі. Тая самая з'ява іміграцыі асветлена гэтым духам, у знаку гасціннасці, інтрэграцыі і законнасці, нягледзячы на цяжкасці і страхі, з усведамленнем рабіць намаганні для належнай супольнай адказнасці.

Народам і краінам мы адрасуем нашае заахвочванне даць адказ нават на моцныя прывабы секулярызму, які штурхае на тое, каб жыць без Бога ці да таго, каб абмежаваць Яго толькі ў прыватнай прасторы, падмацоўваючы парастак індывідуалізму і нараджаючы самотнасць. Між іншым, вядома, наколькі адкрытасць для жыцця на ўсіх яго этапах з'яўляецца паказчыкам надзеі, а ўзровень нараджальнасці – найлепшым у дзяржаве паказчыкам здароўя грамадства.

Менавіта рэчаіснасць моладзі – тэма наступнага Сіноду біскупаў Касцёла – стала другой тэмай нашай супольнай увагі. З боку еўрапейскіх епіскапатаў праявілася вялікая сімпатыя, якая перайшла ў малітву, у большую блізкасць, у жаданне слухаць і спадарожнічаць моладзі з цярплівасцю і любоўю.

Касцёл моцна верыць у моладзь, мае да яе павагу і давер, як маці да сваіх дзяцей. Падчас працы ўсплылі таксама пэўныя занепакоенасці, а між іншым аморфная культура, якой усе мы дыхаем, распаўсюджванне і пагаршэнне індывідуалізму, што нараджае няўпэўненасць і самотнасць, а таксама некаторыя канфлікты і несправядлівасць, якія яшчэ і сёння наносяць шкоду вялікаму дабру міра. Гэта матывы, якія пацвярджаюць наш абавязак быць поплеч з імі; даць адчуць, што Евангелле – гэта вялікае «так» жыццю, любові, свабодзе, радасці: гэта «так» Хрысту.

На гэтым шляху нашы супольнасці з намі і з нашымі святарамі, каб быць знакам надзеі, еднасці, дзейснай добразычлівасці: глыбокі і жывы корань – гэта Хрыстус, які прамаўляе да сэрца і да розуму кожнага жыхара кантыненту, каб даць магчымасць адшукаць сябе па-за палітыкай і эканомікай.

Нам бы хацелася, каб слова Езуса дасягнула сэрца Еўропы: «Не бойся, Я з табою». Не бойся, старажытная Еўропа, быць сама сабою, вярніся на шлях айцоў, якія марылі пра цябе як пра дом народаў і краін, як пра плодную маці дзяцей і цывілізацый, як пра зямлю адкрытага і цэласнага гуманізму. Так, не бойся, май давер! Касцёл, які з'яўляецца спецыялістам у чалавечнасці, – твой сябра: з позіркам, скіраваным на Хрыста і з Евангеллем у руках ён разам з табою ідзе да будучыні паяднання, справядлівасці і міру.

*Паводле Catholic.by*

# КАРДЫНАЛ БАНЬЯСКА ПРА БЕЛАРУСЬ: «БАЧУ МАГЧЫМАСЦЬ АРГАНІЗАВАЦЬ ДОБРАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАЙ І МЯСЦОВЫМ КАСЦЁЛАМ»

*Кардыналу Анджэло Баньяска 74 гады. На працягу 10 гадоў ён узначальваў італьянскі епіскапат – найбуйнейшую Канферэнцыю Біскупаў у свеце*




У 2016 годзе яго абралі старшынёй Рады Канферэнцый Біскупаў Еўропы (РКБЕ). Мінск як пляцоўка пленарнага пасяджэння РКБЕ стаў першым горадам Усходняй Еўропы, які кардынал наведаў у гэтым статусе.

***– Эмінэнцыя прабыў у Беларусі чатыры дні. Якім Вы ўбачылі Касцёл у Беларусі?***

– Больш за ўсё мяне ўразіла жывая вера людзей, якіх я бачыў на Імшах. Паўсюль, дзе мы былі, было шмат людзей, якія маліліся з усёю сваёю пабожнасцю, і гэта адчувалася. Як моладзь, так і пажылыя людзі.

Трэба памятаць, што пажылым людзям, захоўваючы веру, шмат чаго прыйшлося выцярпець. Яны — багацце хрысціянскай культуры. Гэта дзякуючы ім сённяшні Касцёл у Беларусі можа дыхаць свабодна.

***– Падчас прэс-канферэнцыі Вы адзначылі, што вырашэнне праблем нацыянальных Касцёлаў не ўваходзіць у задачы РКБЕ. У сувязі з гэтым хацеў бы пацікавіцца: тым не менш – якія праблемы іерарх пабачыў у Беларусі?***

– Мы не бачылі, мы толькі чулі. Нам расказвалі, што ёсць пэўныя цяжкасці ў святароў з-за мяжы, якія хочуць несці служэнне ў Беларусі.

Як біскупы мы маем досвед у гэтых справах. У сувязі з гэтым я асабіста бачу юрыдычную магчымасць арганізаваць добрае супрацоўніцтва паміж дзяржавай і мясцовым Касцёлам у справе дазволу на працу святарам з іншых краін.

***– Урад Беларусі не раз выказваўся аб тым, што Беларусь стала б ідэальнай пляцоўкай для сустрэчы Папы Рымскага і Патрыярха Праваслаўнай Царквы, як гэта адбылося ў Гаване. Ці бачыць кардынал Беларусь месцам такой сустрэчы?***

– Выказвацца на гэту тэму – не ў маёй кампетэнцыі. Таму не магу нічога сказаць пра магчымасць такой сустрэчы.

*Працяг на стар. 8*

# КАРДЫНАЛ БАНЬЯСКА ПРА БЕЛАРУСЬ: «БАЧУ МАГЧЫМАСЦЬ АРГАНІЗАВАЦЬ ДОБРАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАЙ І МЯСЦОВЫМ КАСЦЁЛАМ»

*Заканчэне. Пачатак на стар. 7*

***– Ці задаволены Вы пасяджэннем РКБЕ у Мінску?***

– Вельмі задаволены. Тым, што мы рабілі, як гэта перажывалі, пра што размаўлялі. Задаволены тым, што адбывалася на саміх пасяджэннях, што мы ўбачылі падчас сустрэч з хрысціянскай супольнасцю. Таксама задаволены той працай, якую мы зрабілі ўнутры гэтых сустрэч. Нам спрыяла адкрытая і братэрская атмасфера, таму дыялог атрымаўся канструктыўны.

На пасяджэнні мы закранулі дзве тэмы: тэму Еўропы і яе хрысціянскіх каранёў і тэму моладзі ў Еўропе, якім чынам Касцёл павінен выходзіць да маладых, каб зрабіць душпастырства моладзі больш адкрытым і зразумелым.

Таксама прыгадваю прамову вашага прэзідэнта, які ў сваім выступленні рабіў вялікі акцэнт на тым, што сям'я мае патрэбу ў абароне, фармацыі і апоры на традыцыйныя каштоўнасці.

***– У свой час кардынал быў душпастырам моладзі. На Вашу думку, наколькі змянілася сама моладзь за гэтыя часы ці змяніліся проста падыходы, якія варта выкарыстоўваць у душпастырстве?***

– 30 гадоў я працаваў у парафіі, дзе маім заданнем была праца з моладдзю. І калі паглядзець на моладзь 70-80-90-хх і сённяшнюю моладзь, то бачна, што моладзь жыве ў такім клімаце рэлятывізму, дзе няма праўды, а ёсць меркаванні.

У гэтым клімаце сучасная моладзь адчувае сябе згубленай. Сёння моладзь мае складанасць у распазнанні дабра і зла. Яны згубленыя ва ўласнай ідэнтычнасці.

Сацыёлагі кажуць, што галоўнай праблемай моладзі з'яўляецца згубленасць. Мы як біскупы бачым, што сучасная моладзь патрабуе «пункты прыналежнасці». Такімі пунктамі можа быць сям'я, дзяржаўныя інстытуцыі і Касцёл. Сучасная моладзь мае культурнае багацце і паўнату. Яны могуць многае зрабіць, але не ведаюць, у якім напрамку рухацца.

Мы, святары, пастыры пакліканы быць побач з моладдзю рознымі спосабамі. Галоўным чынам прабываючы з імі, нават калі гэта складана. Я займаўся гэтым на працягу 30 гадоў і ведаю, што значыць быць заўсёды дасяжным для іх. Трэба быць сярод іх.

Другая рэч – трэба ўмець слухаць, і рабіць гэта, перш чым даваць адказы. Трэцяе – правакаваць, выклікаць глыбокія пытанні, якія прысутнічаюць у сэрцах маладых людзей і якія выходзяць вонкі. Менавіта па прычыне вялікай агульнай культурнай разгубленасці нашай Еўропы, Захаду пачынаюць паўставаць радыкальныя пытанні: які сэнс мае наша, маё жыццё? Што я павінен рабіць? Хто я такі? Які сэнс мае гісторыя? Ці ёсць нешта пасля смерці, ці няма больш нічога?

Тое, што я бачу, гэта прабуджэнне маладых. Яны адкрытыя і маюць патэнцыял. І гэта вялікая ласка, што ім патрэбная наша дапамога. Таму мы павінны адпаведным чынам задаволіць іх патрэбы.



***– Што чакае кардынал ад Сіноду Біскупаў у 2018 годзе?***

– Я чакаю абмену вопытам і знаёмства з іншай рэальнасцю – не толькі еўрапейскай, але і амерыканскай, афрыканскай. А таксама прапаноў у справе душпастырства маладых.

***– Дзе пройдзе наступнае пасяджэнне РКБЕ?***

– Наступная асамблея пройдзе праз год у Познані (Польшча). Тэма яшчэ не зацверджана. Будзем чакаць прапаноў ад біскупаў.

*Ілья Лапато*
*Паводле Catholic.by*

# ІНАЎГУРАЦЫЯ КАТЭДРАЛЬНАГА КАПІТУЛА ПРАЙШЛА Ў МІНСКАЙ КАТЭДРЫ

*12 верасня 2017 г. у мінскім архікатэдральным касцёле прайшла цырымонія інаўгурацыі катэдральнага капітула святога Арханёла Міхала і Маці Божай Будслаўскай, падчас якой грэміяльныя і ганаровыя канонікі склалі прысягу*




Грэміяльныя канонікі атрымалі падчас інаўгурацыі капітула сімвалічныя пярсцёнкі і крыжы – знакі адрознення грэміяльных канонікаў.

Катэдральны капітул Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі быў заснаваны 13 красавіка 2017 года. Да гэтага катэдральныя капітулы ў Беларусі ўжо былі заснаваны ў Віцебскай і Гродзенскай дыяцэзіях.

**Хто такія канонікі?**

Прэзбітэраў, якія з'яўляюцца членамі капітула, называюць канонікамі. Да іх заданняў належыць здзяйсненне найбольш урачыстых літургічных цэлебрацый у катэдральным касцёле, а таксама выкананне тых абавязкаў, якія на іх ускладзены правам або дыяцэзіяльным біскупам. Асноўным дакументам, які рэгулюе дзейнасць капітула, з'яўляецца яго статут.

Канонікі капітула падзяляюцца на дзве групы: грэміяльныя канонікі і ганаровыя канонікі. Прызначэнне канонікам носіць характар асаблівай адзнакі і прызнання заслуг перад дыяцэзіяй.

Грэміяльныя канонікі ў капітуле выконваюць разнастайныя функцыі: дэкана (старшыні), тэолага, пенітэнцыярыя, цырымоніймайстра, кусташа, сакратара. У Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі прызначаны 8 грэміяльных і 10 ганаровых канонікаў.

12 верасня прайшла цырымонія інаўгурацыі катэдральнага капітула святога Арханёла Міхала і Маці Божай Будслаўскай. Урачыстую святую Імшу ўзначаліў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

*Працяг. на стар. 10*

# ІНАЎГУРАЦЫЯ КАТЭДРАЛЬНАГА КАПІТУЛА ПРАЙШЛА Ў МІНСКАЙ КАТЭДРЫ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 9*

«Нашы продкі больш за 300 гадоў таму гэты прыгожы Божы дом прысвяцілі Імені Марыі – Маці нашага Збаўцы і нашай духоўнай Маці, – сказаў у гаміліі арцыбіскуп. – Сімвалічна, што ў гербе Мінска таксама знаходзіцца выява Марыі, аб чым добра ўзгадаць асабліва ў гэтым годзе, калі сталіца Беларусі святкуе юбілей 950-годдзя свайго заснавання. Ужо тады жыхары гэтага горада над Свіслаччу абралі Марыю сваёй заступніцай».

Кажучы пра інаўгурацыю Мінскага катэдральнага капітула, іерарх нагадаў, што капітул канонікаў мінскай катэдры існаваў у мінулыя часы перад кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г., аднак з-за пераследу веры перастаў існаваць.

«Ажыццяўленне фацімскага прароцтва аб навяртанні нашых земляў дало магчымасць адраджэння Мінскага катэдральнага капітула, – сказаў Мітрапаліт. – Сённяшняя цырымонія інаўгурацыі катэдральнага капітула – гэта яшчэ адзін знак адраджэння Касцёла і яго прызнання Апостальскім Пасадам. Гэта таксама знак прызнання заслуг асобаў, якія ўнеслі і далей уносяць свой уклад у адраджэнне і развіццё Касцёла ў нашай краіне».

Паводле слоў арцыпастыра, «абіраючы Маці Божую Будслаўскую і св. Міхала Арханёла сваімі апекунамі, Мінскі катэдральны капітул хоча падзякаваць ім за апеку і дапамогу падчас цяжкага перыяду ганенняў, а таксама прасіць благаслаўлення на змаганні за чысціню веры і маральныя каштоўнасці, якіх сучасны свет не ўспрымае».

Іерарх пажадаў, каб «святое Імя Марыі падтрымлівала Мінскі катэдральны капітул, каб ён быў радасцю нашага Касцёла», і каб, беручы прыклад са святога Міхала Арханёла, «Касцёл і далей дапамагаў людзям на першае месца ставіць веру ў Бога, без якой няма збаўлення».

**Катэдральны капітул у Мінску**

Катэдральны капітул у Мінску быў заснаваны 14 студзеня 2017 года Кангрэгацыяй па справах Духавенства.

Галоўнымі функцыямі капітула з’яўляецца дапамога біскупу, удзел у найбольш урачыстых цэлебрацыях у катэдральным касцёле ў Мінску і ў іншых месцах архідыяцэзіі, арганізацыя ў катэдральным касцёле канферэнцый і сімпозіумаў, прысвечаных дакументам Святога Айца і Апостальскай Сталіцы, паглыбленне культу святога Арханёла Міхала і Маці Божай Будслаўскай, дапамога Мітрапаліту Мінска-Магілёўскаму, забеспячэнне вернікам магчымасці прыступаць да сакрамэнту пакаяння праз дзейнасць каноніка пенітэнцыярыя.

*Паводле Catholic.by*







# ЗАВЯРШЫЛАСЯ ПЕРЭГРЫНАЦЫЯ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ У МІНСКА-МАГІЛЁЎСКАЙ АРХІДЫЯЦЭЗІІ

*15 кастрычніка ў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі завяршылася перэгрынацыя фігура Маці Божай Фацімскай. Фігура вярнулася ў мінскі архікатэдральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі, адкуль год таму 16 кастрычніка распачыналася яе перэгрынацыя*




У апошні дзень перэгрынацыі спачатку адбылася святая Імша ў мінскім касцёле Св. Сымона і Св. Алены, якую ўзначаліў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Адтуль у працэсіі фігура была перанесена ў архікатэдру. Там прайшла святая Імша на заканчэнне юбілейнага года фацімскіх аб'яўленняў.

У архікатэдры фігуру змясцілі ў бочным алтары, спецыяльна падрыхтаваным да 100-годдзя фацімскіх аб'яўленняў.

У сваёй гаміліі падчас Імшы ў архікатэдральным касцёле Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч назваў вялікую перэгрынацыю фацімскай фігуры па парафіях архідыяцэзіі своеасаблівымі «дыяцэзіяльнымі рэкалекцыямі».

«Статуя-пілігрым, пасля таго, як пераадолела шлях даўжынёй каля 5 тысяч км, сёння вяртаецца ў мінскую катэдру, каб тут застацца назаўсёды, – сказаў іерарх. – Дзякуем Табе, Марыя, што ў сваёй фацімскай фігуры Ты захацела наведаць нас у гэты асаблівы час гісторыі нашай краіны і свету, каб абудзіць у нас, людзях ужо XXI стагоддзя, якія часта жывуць так, як быццам Бог не існуе, дух малітвы і навяртання і ўдыхнуць новую надзею».

«100 гадоў таму людзі, якія былі самазадаволеныя і імкнуліся да ўлады над усім светам, забыліся пра Бога. У той час, калі яны зачынілі перад Ім дзверы сваіх сэрцаў, над Фацімай адкрылася неба, як кажа папа Бенедыкт XVI. Згодна з Божым планам, Марыя зышла на зямлю, каб папярэдзіць чалавецтва аб надыходзячых пагрозах, якія нёс атэістычны рэжым, і паказаць шлях, як іх пазбегнуць, вучыць св. Ян Павел II. А паводле папы Францішка, тады, у надыходзячай духоўнай цемры, Марыя запаліла промень надзеі. Ён свяціў нам на працягу трох пакаленняў ганенняў на Касцёл і веру», – адзначыў арцыпастыр.

«Дадзеная Божай Маці надзея ажыццяўляецца, так што можна гаварыць аб цудзе, бо яшчэ зусім нядаўна непарушны, як здавалася, Савецкі Саюз распаўся і мы атрымалі свабоду веравызнання, – дадаў Мітрапаліт. – Аднак злы дух не спіць, ён заўсёды дзейнічае, і сёння, па прашэсці 100 гадоў з часу фацімскіх аб'яўленняў, сітуацыя стала яшчэ больш небяспечнай. Як шмат бедаў і няшчасцяў вакол нас. Колькі насілля, войнаў, тэрарыстычных актаў, несправядлівасці. Колькі разбітых сем'яў. Самы вялікі Божы дар, якім з'яўляецца жыццё, не шануецца і становіцца таварам, які можна купіць і прадаць, ім можна маніпуляваць. Сучасная культура, замест таго, каб абвяшчаць праўду Евангелля і цывілізацыю жыцця, прапагандуе антыевангелле і цывілізацыю смерці».

«Таму фацімскае пасланне Марыі не вычарпала сябе і надалей застаецца актуальным. У ім Божая Маці вучыць нас чытаць знакі часу і адказваць на іх. Яе пасланне – гэта не што іншае, як праяўленне матчынага клопату аб лёсах чалавецтва, якое патрабуе малітвы і навяртання», – падкрэсліў іерарх.

«Нягледзячы на тое, што тэндэнцыі сучаснага свету нагадваюць аб адсутнасці надзеі, тым не менш рэальнасць іншая.

*Працяг. на стар. 12*

# ЗАВЯРШЫЛАСЯ ПЕРЭГРЫНАЦЫЯ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ У МІНСКА-МАГІЛЁЎСКАЙ АРХІДЫЯЦЭЗІІ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 11*

Калі ўважліва прыгледзімся да жыцця, то ўбачым, што Бог не памёр і не пайшоў у адпачынак, а дзейнічае. Першаснай мэтай заклiку Марыі да малітвы і навяртання з'яўляецца не толькі і не столькі адлюстраваць цёмную карціну сучаснага свету, але паказаць любоў Бога да чалавека. Таму нам неабходна жыць атрыманай ад Марыі ў Фаціме надзеяй», – звярнуў увагу Мітрапаліт.

«Мы павінны мець пачуццё адказнасці за наш лёс і нашу будучыню. Аднак пры гэтым неабходна памятаць, што не зможам вырашыць гэтага задання і супрацьстаяць згубным тэндэнцыям сучаснасці, калі на хрысціянскіх каштоўнасцях не збудуем адпаведна моцнага духоўнага падмурку. А для гэтага неабходна, каб дух Евангелля прасякнуў нашыя сэрцы і розум», – патлумачыў арцыбіскуп Кандрусевіч.

«Нам неабходна аднова, якую можа даць толькі Бог. Да такой адновы праз малітву і навяртанне заклікае Марыя, – адзначыў іерарх. – Фацімскае пасланне перасцерагае людзей, каб не паддаваліся спакусам злога духа, бо мэтай чалавека ёсць неба, дзе бязмежны ў сваёй міласэрнасці Бог чакае нас».

«Збаўленне і грэх, святло і цемра, малітва і навяртанне, любоў, ахвяра і вечнае збаўленне – ці не ў гэтым сутнасць фацімскага паслання? Ці яно не з'яўляецца шляхам хрысціянскага жыцця? Ці не ў яго святле знаходзіцца сапраўдны мір і радасць?» – працягваў Мітрапаліт.

«Сёння, як зямныя пілігрымы, мы прыходзім да Цябе, Фацімская Пані, Каралева Ружанца, з удзячнасцю, з нашымі праблемамі і надзеямі. Да Твайго падножжа прыносім трывогі і просьбы, якія патрабуюць святла і любові. У Тваім фацімскім пасланні мы бачым шлях да будавання справядлівага жыцця, міру і збаўлення, – сказаў арцыпастыр. – Фацімскія аб'яўленні і сёння, па прашэсці стагоддзя, свецяць зыходзячым з Твайго ўлоння святлом, якім ёсць Езус Хрыстус».

Фігура Фацімскай Панны, благаслаўлёная Мітрапалітам Тадэвушам Кандрусевічам у Фаціме 4 кастрычніка 2016 г., прыбыла ў Беларусь 13 кастрычніка з нагоды святкавання 100-годдзя аб'яўленняў Маці Божай у Фаціме. За год сваёй перэгрынацыі фігура наведала больш за 120 парафій толькі ў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. Перэгрынацыя была арганізавана ва ўсіх дыяцэзіях Беларусі.

*Паводле Catholic.by*







# АДКРЫЦЬ ГЛЫБІНЮ РУЖАНЦА

*У кастрычніку Касцёл заахвочвае нас нанова адкрыць хараство ружанцовай малітвы. Адчуваючы еднасць з усім Касцёлам («sentire cum Ecclesia»), мы таксама прагнем адкрываць глыбіню Ружанца, таму запрашаем у Магілёў на Ружанцовы кангрэс, які адбудзецца ў суботу, 21 кастрычніка. Распачнецца кангрэс рэгістрацыяй у 9:00–10:15, а скончыцца ў 18:30*

Запрашаем перадусім тых людзей, якія жадаюць нанова запалаць апостальскаю руплівасцю і стаць евангелізатарамі – найперш праз уласнае навяртанне і малітву, а таксама праз заахвочванне іншых да гэтай незвычайнай малітвы, якая датычыцца найвялікшых таямніцаў хрысціянства і перамяняе жыццё, пульсуючы Божым словам, калі мы выкарыстоўваем яе належным чынам.

Вядома, што «вера, якая не змяняе жыццё, не збаўляе», альбо, як сказаў кардынал Зянон Грахалеўскі, «святасць жыцця залежыць ад якасці малітвы». Для таго, каб нанова асэнсаваць запрашэнне да ружанцовай малітвы, якое Марыя скіравала да нас у Фаціме, мы жадаем у час кангрэсу яшчэ раз звярнуцца да Яе словаў, да разважанняў вялікіх Папаў, да традыцыі і ўважліва прыгледзецца да асобы Барталамея Лонга, свецкага чалавека, юрыста, які навярнуўся да Бога пасля сатанізму, пабудаваў ружанцовую базыліку ў Пампеях і як дамініканскі тэрцыярый стаў апосталам міласэрнасці і ружанцовай малітвы.

Для нас, сяброў Марыі, Каралевы Святога Ружанца, важным і вельмі актуальным застаецца апостальскі ліст пра Ружанец св. Яна Паўла II«Rosarium Virginis Mariae». Многія заклікі і прапановы Святога Айца мы дагэтуль не прынялі і не прымяняем у жыцці. У пасланні на трэцяе тысячагоддзе святы папа Ян Павел II піша, што малітве трэба ўвесь час вучыцца нанова (NMI, 32).

У сувязі з гэтым варта звярнуць увагу на вельмі стары метад малітвы на ружанцы. Пра яго згадваў благаслаўлёны папа Павел VI у адгартацыі «Marialis Cultus», пра якую таксама піша святы папа Ян Павел II у вышэйзгаданым лісце пра Ружанец (RVM, 33), а менавіта пра метадмалітоўных дадаткаў. Ён заключаецца ў тым, што пасля слова «Езус» у малітве «Вітай, Марыя…» дадаюцца словы – найлепш са Святога Пісання, якія дапамагаюць засяродзіцца на разважанні і медытацыі над гэтаю таямніцаю (напрыклад, «Вітай, Марыя, поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус, які пасля ўваскрасення аб’явіўся Апосталам у Вячэрніку. Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн»). <…>

У лісце пра Ружанец (RVM, 42) Ян Павел II узнімае пытанне пра тое, ці можна прапаноўваць гэтую малітву дзецям і моладзі, ці не будзе яна занадта нуднаю для іх. У адказ Святы Айцец напісаў, што ўсё залежыць ад таго, як яе падаць. Можна аддаліць ад ружанцовай малітвы, а можна заахвоціць да яе. Зразумела, без асаблівай Божай ласкі ў духоўных справах нічога немагчыма зрабіць…

Нязвыкла гучыць гэтае заахвочванне да ружанцовай малітвы ў сям’і (RVM, 41 і 43). Як цудоўна, калі клопат пра супольную малітву ў сям’і спалучаецца таксама са школаю няспыннага ўдасканалення навыкаў ружанцовай малітвы! Я перакананы, што нельга недаацэньваць дробязяў, напрыклад, атмасферы малітвы, у стварэнні якой могуць дапамагчы прыгожы абраз, запаленая свечка, выкарыстанне дадаткаў (хаця б час ад часу). Узбагачаюць і абнаўляюць малітву спантанныя акты падзякі, просьбы ці перапрашэння, выказаныя на самым яе пачатку. І асабліва ўзрушвае ружанцовая малітва, якую праводзяць дзеці і моладзь. Гэта проста цудоўна!

Хацеў бы яшчэ падзяліцца з чытачамі некаторымі планамі адносна Ружанцовага кангрэсу. Перш за ўсё вельмі прашу вас, браты і сёстры, аб малітве ў гэтай інтэнцыі. У праграму мяркуецца ўключыць чатыры катэхезы, якія правядуць члены дамініканскай сям’і (браты, сястра і тэрцыярка). Мы жадаем супольна памаліцца Ружанец з дадаткамі, спяваючы пры гэтым даксалогію. Будзе таксама час на сведчанне пра плён ружанцовай малітвы ў жыцці канкрэтных людзей і сем’яў. Мы падрыхтуем шмат захапляльных бясплатных ружанцовых гаджатаў: дыск CD з запісам усіх ружанцовых таямніцаў з дадаткамі, кашулькі, кубкі, асадкі, торбачкі, магчыма, таксама DVD. Кангрэс завершыцца ўрачыстаю Эўхарыстыяй. У ім прымуць удзел супрацоўнікі выдавецтва «Pro Christo» са сваім «ружанцовым стэндам». Удзельнікі змогуць набыць новую кніжку кс. Марка Дзявецкага з ружанцовым разважаннямі для сем’яў з малітоўнымі дадаткамі.

Ружанцовы кангрэс, мэта якога абудзіць у нас яшчэ больш гарачую любоў да ружанцовай малітвы, споўніць сваё прызначэнне тады, калі з кожнай ружанцовай групы, якія існуюць у парафіях нашай Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, хоць адзін чалавек прыме ўдзел у ім, падзеліцца плёнам гэтай сустрэчы з сябрамі сваёй ружанцовай групы, а можа, нават з усёй парафіяй. Запрашаем таксама святароў, сясцёр і прадстаўнікоў групаў «Жывога Ружанца» з усіх дыяцэзій.

*Кантакты*:
*А. Раман*, тэл. + 375292919211; +48664570570
(schulzop@gmail.com)
або *а. Павел*, тэл. +375299202007.
Адрас для карэспандэнцыі: а. Раман Шульц OP, вул. Якубоўскага, 39/18, 212026, Магілёў.

*Айцец Раман Шульц OP*
*Паводле Ave Maria*

# РУЖАНЦОВЫЯ РАЗВАЖАННІ СА СВЯТЫМ ЯНАМ ПАЎЛАМ II

*Разважанне над жыццём Езуса Хрыста і Найсвяцейшай Багародзіцы – неад'емны складнік ружанцовай малітвы. Гэтыя ружанцовыя разважанні складзеныя на аснове выказванняў і пасланняў Вялікага Папы, які заўсёды заахвочваў вернікаў да гэтай плённай малітвы*



## ТАЯМНІЦЫ РАДАСНЫЯ

***I. Звеставанне Найсвяцейшай Панне Марыі***

Марыя выказвае сваю поўную згоду думкаю і сэрцам на таямнічую Божую волю і гатовая прыняць, спачатку вераю, а потым у сваім дзявочым улонні Сына Божага. «Вось Я!». (...) Марыя дадае нам надзеі, каб мы верылі ў здзяйсненне абяцанняў Божых. Яна заклікае нас мець у сабе дух пакоры, адпаведную ўнутраную паставу стварэння да Стварца. Яна заахвочвае нас ускладаць бяспечную надзею на Хрыста, які рэалізуе ва ўсёй паўнаце збаўчы план нават тады, калі падзеі здаюцца страшнымі і цяжкімі для прыняцця.

***II. Адведзіны Паннай Марыяй святой Альжбеты***

Сустрэча з Альжбетаю мае характар радаснай збаўчай падзеі, яна не толькі з'яўляецца спантаннаю праяваю добразычлівасці, якую Марыя аказвае сваячцы. У дом Захарыі, які страціў мову з-за ўласнага малавер'я, Марыя нечакана ўносіць радасць сваёй веры, адкрытай і гатовай да служэння. Наведваючы св. Альжбету, Марыя як бы прадказвае місію Езуса, а супрацоўнічаючы з самага пачатку свайго мацярынства з адкупленчай справай Сына, становіцца прыкладам гэтых членаў Касцёла, якія вырушаюць у дарогу, каб несці святло і радасць Хрыста людзям усіх краінаў і ўсіх часоў.

***III. Нараджэнне Езуса Хрыста***

Зняволенаму і церпячаму народу, які крочыў у цемры, паказалася «святло вялікае». (...) Калі першае стварэнне пачалося ад стварэння святла, то тым больш ззяе бляскам і з'яўляецца вялікім святлом, якое дае пачатак новаму стварэнню: ім ёсць сам Бог, які стаў чалавекам. Вестка аб нараджэнні Божага Сына суцяшае і адначасова ставіць патрабаванні. Вера дазваляе нам адчуць, што Бог атачае нас сваёю чулаю любоўю і адначасова заахвочвае нас да чыннай любові да Бога і братоў.

***V. Ахвяраванне Хрыста ў святыні***

«Цяпер адпускаеш слугу Твайго, Валадару, па слову Твайму, з мірам; бо бачылі вочы мае збаўленне Тваё, якое Ты падрыхтаваў перад абліччам народаў: святло для асвячэння паганаў і славу народу Твайго Ізраіля». (...) Хрыстус з'яўляецца святлом жыцця чалавека. З'яўляецца святлом, бо рассейвае яго цемру. З'яўляецца святлом, бо асвячае яго таямніцу. Бо адначасова адказвае на асноўныя і канчатковыя пытанні. З'яўляецца святлом, бо надае жыццю сэнс. З'яўляецца святлом, бо пераконвае чалавека ў яго вялікай годнасці.

*Працяг на стар. 15*

# РУЖАНЦОВЫЯ РАЗВАЖАННІ СА СВЯТЫМ ЯНАМ ПАЎЛАМ ІІ

*Працяг. Пачатак на стар. 14*

***V. Езуса знаходзяць у Ерузалемскай святыні***

Калі пасля трохдзённага пошуку Езуса знаходзяць ў святыні паміж настаўнікамі, Марыя робіць Яму лагодны дакор: «Сыне, што Ты зрабіў з намі?». Божыя намеры часта бываюць цяжкімі для зразумення, яны патрабуюць згоды, веры і пакоры. Марыя з’яўляецца для нас прыкладам чалавека, які, аддаючыся кіраўніцтву Духа Святога, прымае і захоўвае ў сэрцы, быццам добрае зерне (пар. Мц 13, 23), словы аб’яўлення, спрабуе іх як мага лепш зразумець, каб пранікнуць у глыбіню таямніцы Хрыста.

## ТАЯМНІЦЫ СВЯТЛА

***I. Хрост Езуса ў Ярдане***

«Гэта Сын Мой Умілаваны!». Голас з неба над Ярданам, безумоўна, адносіўся да Езуса, адзінага сапраўднага спрадвечнага Сына Божага. Але сёння і падчас кожнага хросту гэтыя словы з неба яшчэ як бы па-новаму прамаўляюцца над кожным ахрышчаным (...). Трэба, каб зерне ласкі, пакладзенае ў нашых сэрцах, г.зн. унутры ахрышчаных, узрастала і прыносіла багаты плён (...). Таксама і вы, дарослыя, пакліканы да жыцця згоднага вашаму хросту, г.зн. да аднаўлення сваёй веры ў Пана і сваіх касцёльных абавязкаў, таму што тое, што (падчас хросту) здзяйсняем, далучае нас усіх асабіста.

***II. Езус аб'яўляе сябе на вяселлі ў Кане***

У любым выпадку Яе вера ў Сына застаецца ўзнагароджанаю. Езус, якому Яна цалкам аддае ініцыятыву, здзяйсняе цуд, прызнаючы адвагу і пакору Маці. Просьба Марыі: «Зрабіце ўсё, што толькі вам скажа» (гл. Ян 2, 5), застаецца заўсёды актуальнай для хрысціянаў кожнай эпохі, а яе мэта – аднавіць цудоўныя вынікі ў жыцці кожнага чалавека (...). Эпізод вясельнага святкавання ў Кане Галілейскай заахвочвае нас быць адважнымі ў веры і сведчыць у нашым жыцці аб праўдзе евангельскіх слоў: «Прасіце, і дадзена вам будзе».

***III. Абвяшчэнне Божага Валадарства і заклік да навяртання***

Чалавек не з’яўляецца пасіўным сведкам уваходу Бога ў гісторыю. Езус заклікае нас чынна клапа- ціцца аб Божым валадарстве і аб Яго справядлівасці і хоча, каб гэта стала нашым асноўным клопатам. Таму што чалавек пакліканы, каб рукамі, розумам і сэрцам садзейнічаць пашырэнню Божага валадарства на свеце. Адносіцца гэта асабліва да тых, хто пакліканы да апостальства, але датычыць таксама і кожнага чалавека.

***IV. Перамяненне Езуса на гары Табор***

У хвіліну перамянення ўдаецца пачуць голас Айца нябеснага: «Гэта Сын Мой Умілаваны, Яго слухайце!» (гл. Мц 9, 7). У гэтых словах заключаецца ўся праграма: мы павінны слухаць Езуса. Ён аб’яўляе нам Айца і аб’яўляе нам аб тым, хто мы такія; Ён аб’яўляе чалавека самаму чалавеку. А таму не бу- дзем жа баяцца Хрыста! Узносячы нас да вышыняў свайго Боскага жыцця, Ён не пазбаўляе нас чалавечнасці, але, наадварот, робіць нас больш людзьмі, надаючы поўны сэнс нашаму асабістаму і грамадскаму жыццю.

***V. Устанаўленне Эўхарыстыі***

Езус устанавіў Эўхарыстыю, бо Ён хацеў, каб Яго адкупленчая ахвяра трывала ў кожнай эпосе і для кожнага пакалення. Будзем вучыцца ад Найсвяцейшай Панны, жыццё якой было сапраўднай «эўхарыстычнай экзістэнцыяй». Яна дазволіла цалкам сфармавацца праз прысутнасць свайго Божага Сына (...). Яна – поўная ласкі, з’яўляецца жывым табэрнакулюмам уцелаўлёнага Слова. Праслаўляючы Хрыста Пана, прысутнага ў Эўхарыстыі, звернемся з дзіцячаю ўдзячнасцю да Той, якая стала каралеўскаю Брамаю для Яго прыйсця ў свет.

## ТАЯМНІЦЫ БАЛЕСНЫЯ

***I. Малітва Езуса ў садзе Аліўным***

Гефсеманія – час страху, час пакутаў, смутку, крывавага поту, сяброў, вочы якіх былі соннымі, і якія не разумелі. (...) Гефсеманія – час малітвы, нацягнутай, як струна, сыноўскай размовы з Айцом, прыняцця з любоўю келіха горычы. О, Сябра людзей, Твая пакорлівасць волі Айца з’яўляецца нашаю сілаю ў евангельскіх рашэннях сярод небяспекаў жыцця. Умацуй нас на шляху веры, учыні, каб мы без страху навучыліся аддаваць жыццё ў імя любові Жыцця.

***II. Бічаванне Езуса***

Езус у маўчанні прымае знявагі і здзек. Сярод абсалютнага непаразумення (...). «Пагарджаны і прыніжаны людзьмі, Муж скрухі, які зведаў цярпенні, Ён узяў нашыя немачы». Асвечаныя Праўдаю, якая вызваляе, просім Цябе, навучы нас бачыць Тваё аблічча ў кожным чалавеку. Твая прысутнасць у кожным бедным і пераследаваным чалавеку, у кожным, хто чыніць спакой і справядлівасць, набліжае пакліканага да ласкі Божага сыноўства.

*Працяг на стар. 16*

# РУЖАНЦОВЫЯ РАЗВАЖАННІ СА СВЯТЫМ ЯНАМ ПАЎЛАМ ІІ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 14-15*

***ІІІ. Укаранаванне Езуса цернямі***

Святы Ян схіляе нас да перамены нашага разважання ў малітву, прасякнутую праслаўленнем і чуласцю, бачачы цярпенні Езуса, укаранаванага цернем: Пілат паўторна выйшаў на вуліцу і прамовіў да іх: «Вось Чалавек ... я не знаходжу ў Ім ніякай віны». Езус выйшаў на двор у церневай кароне і пурпурным плашчы (...). З гэтага дня кожнае пакаленне людзей заклікана адкрыцца перад гэтым Чалавекам, укаранаваным цернямі. Ніхто не можа застацца абыякавым. Трэба стаць на Яго бок. І не толькі словам, але таксама і ўчынкамі.

***IV. Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую***

Цяпер Езус, безумоўна, з'яўляецца настаўнікам, які апярэджвае сваіх вучняў, святаром, які ідзе на ахвярны алтар, баранкам, які ўзяў на сабе грэх свету. (...) З гэтага часу распачынаецца вялікае вяртанне чалавека ў дом Айца. З крыжам (...) Езус чакае апошняга з людзей, каб разам з ім несці цяжар жыцця. Езу, святы Святар, абцяжараны крыжам, узыдзі на гару ахвяры, з Тваёю ахвяраю злучы цярпенне ўсіх народаў, і ўсе народы збяры каля дрэва крыжа. Няхай будзе хвала Табе, Хрыстэ. Твой крыж указвае дарогу жыцця, вызначае шлях надзеі.

***V. Укрыжаванне і смерць Езуса***

Двойчы гучным голасам кліча канаючы Езус: «Божа мой, Божа мой, чаму мяне пакінуў?». Гэты зварот таямнічы і поўны болю. Голас надзеі наперакор роспачы, песня перамогі над сіламі зла. Езус пацвярджае тое, што адбылося ў цішыні Вячэрніка, пацвярджае любоў да чалавека, таму што «ніхто не мае большай любові за тую, калі хтосьці аддасць жыццё сваё за сяброў сваіх». Езу, праз Тваю муку і смерць, прабач нам грэх, моцаю Твайго Духа аднаві аблічча зямлі.

## ТАЯМНІЦЫ ХВАЛЕБНЫЯ

***І. Уваскрасенне Хрыста***

Уваскрасенне Хрыста прынесла ўсім новую надзею: з гэтага часу мець надзею не азначае ўжо чакаць нечага, што павінна яшчэ толькі здарыцца. Значыць быць упэўненым, што гэта ўжо адбылося, бо «Пан уваскрос і валадарыць жывы». Мы таксама пакліканы, каб сустрэць Яго асабіста і стаць Яго абвяшчальнікамі і сведкамі, прыкладам жанчын і вучняў. «Уваскрос ужо Хрыстус, Пан мой і надзея», – паўтараем сёння, просячы Яго аб адвазе вернасці і вытрымкі ў добрым. Мы просім Яго асабліва аб супакоі – дары, які здабыў нам праз сваю смерць і ўваскрасенне.

***ІІ. Унебаўшэсце Хрыста***

У Хрысце, узыходзячым у неба, узвышаецца чалавечая натура, пастаўленая праваруч Бога, а вучні атрымліваюць наказ евангелізацыі свету. Больш за тое, Хрыстус, узыходзячы ў неба, не аддаляецца ад зямлі: Ён укрыўся ў кожным чалавеку, асабліва найбольш няшчасным – людзях убогіх, хворых, выкінутых па-за межы грамадства, пераследаваных...

***ІІІ. Спасланне Духа Святога***

«Усе яны трывалі аднадушна ў малітвах і просьбах разам з жанчынамі і Марыяй, Маці Езусавай, ды братамі Ягонымі» (гл. Дз 1, 14). Гэта сцэна сёння стаіць перад вачамі як цалкам актуальная рэчаіснасць (...). Усе разам, пастыры і вернікі, павінны засяроджваць свой позірк на Найсвяцейшай Панне, паслухмянай натхняльніцы першага цэнтра хрысціянскай супольнасці, прызначэнне якога – несці святло Евангелля па ўсёй зямлі і да сканчэння свету.

***IV. Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі***

Унебаўзяцце Марыі раскрывае вялікую каштоўнасць і годнасць чалавечага жыцця. Бачачы прафанацыю і знявагу, якія часта спазнае ў сучасным свеце асабліва жаночае цела, таямніца ўнебаўзяцця гаворыць нам пра звышнатуральнае прызначэнне і годнасць кожнага чалавечага цела, створанага Богам, каб яно станавілася прыладаю святасці і атрымала ўдзел у Яго хвале (...). Углядаючыся ў Марыю, хрысціянін вучыцца адкрываць каштоўнасць уласнага цела і ахоўваць яго як Божую святыню, якая чакае ўваскрасення.

***V. Укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі***

Хрысціяне ўглядаюцца з даверам у Марыю Каралеву, што не толькі не змяншае, але, хутчэй, павялічвае іх сыноўскі давер да Той, якая з'яўляецца іх Маці. (...) Такім чынам, хвалебны стан Марыі не аддаляе Яе ад нас, але дазваляе Ёй быць заўсёды бліжэй да людзей і атачаць іх апекаю. Марыя ведае пра ўсё, што адбываецца ў нашым жыцці, і падтрымлівае нас мацярынскаю любоўю ў жыццёвых выпрабаваннях. (...) Узятая да хвалы нябёсаў, Марыя цалкам аддаецца справе збаўлення, каб адарыць кожнага чалавека шчасцем, якое стала Яе лёсам.

*Паводле Ave Maria*

# ЯКОЙ ЖАНЧЫНАЙ БЫЛА МАЦІ ЗБАЎЦЫ?



На працягу стагоддзяў на Марыю ўказвалі як на прыклад для ўсіх жанчын і ўзор жаночай духоўнасці. Па-рознаму разумелі і прадстаўлялі яе асобу: у большай ступені рабілі акцэнт на тыя рысы, якія найбольш адпавядалі жанчынам дадзенай эпохі; выявы Марыі таксама адпавядалі стандартам прыгажосці і моды дадзенай эпохі. Адначасова яе заўсёды ўспрымалі як чалавека, які знаходзіцца блізка да Езуса і з'яўляецца дасканалым прыкладам жыцця сканцэнтраванага на Богу. Такім чынам, якой жанчынай была Маці Збаўцы?

У Евангеллі ўпершыню Марыя ўзгадваецца ў словах пасланца, які называе яе "Поўнай ласкі". Анёл заклікае яе ўзрадавацца і абяцае пастаянную прысутнасць Бога побач з ёй. Тэолагі бачылі ў прывітальных словах анёла эфект дзейнасці гэтай ласкі і, тым самым, бачылі шматлікія прыгажосці Абранай дзяўчыны – прыгажосць яе духа, псіхікі, асобы. Яны бачылі прыгажосць чалавека, які захапляецца Богам і напоўнены Ягонай прысутнасцю – такога чалавека цяжка прадставіць, праілюстраваць, і кожная эпоха рабіла гэта па-рознаму, выкарыстоўваючы свае ўяўленні. Шматлікія выявы Марыі часцей за ўсё гавораць нам пра густ мастака, а не пра прыгажосць Марыі. Чытаючы марыйныя тэксты, часцей за ўсё ў іх можна разглядзець мадэль жаноцкасці, які хоча перадаць аўтар, а не саму Марыю.

Біблійныя вобразы Марыі паказваюць прыгажосць Божай ласкі ў чалавеку – моцную, рашучую Дзяўчыну, вольную ў сваіх рашэннях і дзеяннях, мужную, поўную прыгажосці Божай прысутнасці.

Постаць Марыі ў пабожнай літаратуры часта прадстаўляецца як дасканалы прыклад для жанчын. Разважаючы над Дабравешчаннем, можна заўважыць бязмежную пакорлівасць Марыі волі Божай, і адначасова разглядзець яе вялікую духоўную самастойнасць. Яна Сама прымае навіну ад пасланца, Сама прымае запрашэнне. Евангелле не гаворыць пра тое, што Марыя шукала падтрымкі ў людскіх аўтарытэтах, хоць Святое Пісаннне і Традыцыя загадвалі карыстацца парадамі бацькі, мужа або законнага апякуна. Паслухмянасць Богу патрабуе ў яе выпадку абсалютнай адданасці, што спалучаецца з вялікай незалежнасцю Марыі. Дзяўчынка-падлетак з маленькага гарадка ў адзіночку прыняла беззваротнае рашэнне аб шлюбе і сямейным жыцці. Духоўная адданасць непарыўна звязана з прысвячэннем цела. Марыя зачала, таму што паверыла. Яна прыняла Слова Божае духам і целам.

Юзаф практычна становіцца перад фактам, ён можа толькі прыняць або адхіліць прызначаную яму ролю мужа, які падпарадкоўваецца Божай волі, што практычна азначае прыняцце пакліканне сваёй жонкі і ролі Яе дзіцяці, бацькам каторага ён на самой справе не з'яўляюцца. Святая сям'я ўвасабляе мадэль духоўнасці, у якой, нягледзячы на традыцыйную, патрыярхальную культуру, духоўнае кіраўніцтва і дамінуючая роля выпала маладой Дзяўчыне. Мужчына – насуперак пануючым звычаям – не становіцца пасрэднікам паміж жанчынай і Богам, яго роля з'яўляецца вельмі важнай, але яна ў поўнай залежнасці ад дарогі, па якой вядуць ягоную Жонку.

Увасабленне пакінула ў святле Марыю, а ў Яе цэню – неверагодную святасць яе мужа. У той час як Пісанне захавала мноства слоў Марыі, евангелісты не палічылі неабходным захаваць словы Юзафа. Маўклівая прысутнасць мужчыны выражаецца ў дзеяннях, якія сведчаць аб яго клопаце пра сям'ю, аб адданасці пакліканню Маці і Дзіцяці. Шлюб з Марыяй вызначае ролю і прызначэнне Юзафа. Гэта Яна кіруе дарогай яго жыцця. Таксама пра Езуса ў Евангеллі гаворыцца як пра "сына Марыі", што ўказвае на выключную важнасць Найсвяцейшай Панны.

*Паводле grodnensis.by*

# СВЯТАЯ МАРЫЯ МАГДАЛЕНА – ПРЫКЛАД ДЛЯ КОЖНАЙ ЖАНЧЫНЫ



22 ліпеня Каталіцкі Касцёл у другі раз адзначае дзень святой Марыі Магдалены як свята. Да 2016 г. гэта быў абавязковы ўспамін. Змена адбылася па жаданні Папы Францішка, які хацеў такім чынам падкрэсліць ролю не толькі гэтай святой жанчыны, якая першая перадала свету звестку аб уваскрасенні Пана Езуса, але і ролю ўсіх жанчын у Касцёле.

Тым самым Святы Айцец звярнуў увагу, што патрэбны глыбейшы погляд на годнасць жанчыны, на новую евангеліяцыю і на вялікую таямніцу Божай міласэрнасці.

Тая, якую святы Тамаш Аквінскі называў “апосталкай апосталаў”, святы Грыгорый Вялікі – “сведкай Божай міласэрнасці”, любячая Пана і моцна любімая Ім – святая Марыя Магдалена. Менавіта яна была пастаўлена прыкладам служэння жанчын у Касцёле.

**Кім была гэтая жанчына?**

Марыя Магдалена атаясамліваецца з распусніцай, якая сустрэла Езуса і парвала з ранейшым стылем жыцця. Святы Грыгорый Вялікі першы атаясаміў Марыю Магдалену з грэшніцай, якая падчас застолля ў Сымона слязьмі абмыла Езусу ногі.

Таксама лічыцца, што Марыя Магдалена – сястра Лазара, якая ў Евангеллі паводле Яна намасціла ногі Езуса пахучымі алеямі (11,2). Яе постаць атачаюць легенды. Біблейскія тэксты ясна ўказваюць, што яна была сведкай уваскрасення Хрыста. Святы Лука піша, што яна была сярод жанчын, якія спадарожнічалі Езусу ў вандроўках па Галілеі (пар. Лк 8, 2-3). Гэты тэкст не ўказвае на тое, што ў групе жанчын былі распусніцы. Там былі жанчыны, якіх Езус вызваліў ад слабасці і ад злых духаў.

Пра яе ж чытаем, што Езус выгнаў з яе сем духаў (пар. Мц 6, 9: Лк 8, 2). Няма ўпэўненасці ў тым, што яна была распусніцай, але мы ведаем, што яна была сведкай уваскрасення Хрыста. Больш за тое, яна – па просьбе самога Езуса – скіравалася да апосталаў, каб паведаміць ім, што Ён уваскрос. Пазней яны сталі абвяшчаць гэтую праўду. Таму слушна, што яна была названа “апосталкай апосталаў”.

**Чаму сёння яна можа быць прыкладам?**

Адказваючы на гэтае пытанне, узгадаем фрагмент дэкрэту, у якім успамін святой Марыі Магдалены ўзводзіцца ў ранг свята. Там гаворыцца: “У нашы часы, калі Касцёл заклікаными яшчэ больш засяродзіцца на годнасці жанчыны, на новай евангелізацыі і на вялікай таямніцы Божай міласэрнасці, здаецца слушнай рэччу, каб таксама постаць св. Марыі Магдалены яшчэ лепш была паказана вернікам”.

Вылучаюцца тры важныя элементы:

– годнасць жанчыны. Езус падчас сваёй дзейнасці ніколі не адкідваў жанчын, не адварочваўся ад іх. Наадварот, Ён дазваляў ім набліжацца да сябе. Ён найлепш ведае годнасць кожнага чалавека, у тым ліку кожнай жанчыны. І менавіта гэтаму Ён вучыў сваіх апосталаў і гэтаму вучыць сёння нас. Таксама Касцёл бачыць годнасць жанчын і цэніць іх уклад у сваё жыццё. Ставячы нам у прыклад св. Марыю Магдалену ў яе адносінах да Настаўніка, Касцёл жадае яшчэ больш падкрэсліць і заўважыць гэтую ролю жанчыны. Яна вучыць нас удзелу ў жыцці Хрыстовага Касцёла.

– новая евангелізацыя. Яна з’яўляецца абвяшчэннем керыгмы, значыць праўды аб тым, што Езус дзеля мяне памёр і ўваскрос. Марыя Магдалена была той, якая першай абвяшчала керыгму, прычым самім апосталам. Яна нічога не баялася, а адважна перадавала словы Пана. Таму яна для нас – прыклад абвяшчэння Евангелля.

– вялікая таямніца Божай міласэрнасці. Марыя Магдалена спазнала Божую міласэрнасць. Вызваленая ад злых духаў і слабасці, яна стала вучаніцай Езуса. Тая, якую Ён палюбіў, яна любіла да канца. Таму яна з’яўляецца для нас прыкладам адкрытасці на Божую міласэрнасць, але і вернага трывання пры Пану.

Таму святая Марыя Магдалена – прыклад для кожнай жанчыны ў Касцёле.

*Кс. Юрый Марціновіч*

*Паводле grodnensis.by*

# ПАЭТЫЧНАЕ СЛОВА Ў ДЗЕНЬ МАЦІ І ЗАКАНЧЭННЯ ПЕРЭГРЫНАЦЫІ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ З НАГОДЫ СВЯТКАВАННЯ 100-ГОДДЗЯ АБ'ЯЎЛЕННЯЎ У ФАЦІМЕ

*У нядзелю 15 кастрычніка ў бібліятэцы Чырвонага касцёла перад вучнямі нядзельнай школы выступілі паэткі Вольга Шпакевіч і Ядвіга Рай*



Вольга Цімафееўна Шпакевіч, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, прачытала свае вершы «Размова з маці», «Хлеб дзяцінства», «Любіце родных» і іншыя. Вольга Цімафееўна працавала настаўніцай у школе, таму яна ведае, як шчырым беларускім словам абудзіць добрыя пачуцці ў дзяцей, як скіраваць іх думкі для роздуму пра месца ў іх жыцці галоўнага чалавека – матулі, пра яе любоў і адвечны клопат пра сваіх дзяцей.

Паэтка падзялілася душэўнымі ўспамінамі пра сваю матулю, якой сёння ўжо 80 гадоў і якая жыве на Берасцейшчыне. Звычайная сувязь з мамай праз тэлефон надае добры настрой на цэлы дзень. Мама і бабуля вучылі Вольгу з дзяцінства верыць і маліцца, любіць людзей і сваю Радзіму, і сёння паэтка імкнецца перадаць такія ж пачуцці сваёй дачцэ і іншым дзецям.

Ядвіга Іванаўна Рай – маці чатырох дзяцей. У гэтым годзе яна ўдзельнічала ў канферэнцыі міжнароднага руху «Маці ў малітве» у Кракаве. Ужо дзесяць гадоў яна піша вершы на духоўныя тэмы і з'яўляецца аўтарам кніг «Сцежкі пілігрыма на скрыжаваннях часу», «Кропелька неба», «Малітва ў дарозе», «Дыханне цішыні». Уражлівая паэтычная душа збірае ў пілігрымках да святынь каштоўныя вобразы, дзеліцца імі са сваімі чытачамі, вучыць братоў і сясцёр



жыць у лагодзе і спакоі, ставіцца адзін да аднаго з пяшчотай і даверам, шанаваць сваіх матуль, якія штодзённай працай і малітвай падтрымліваюць радзінны човен у Божым накірунку.

Паэтычнае слова, якое прагучала ў бібліятэцы касцёла, надало важны сэнс ўрачыстым восеньскім дням, у якія ўспамінаецца любоў Маці Божай да нас і пяшчота кожнай матулі да сваіх дзяцей.

*Эла Дзвінская, фота аўтара*

# ЕПІСКАПАТ БЕЛАРУСІ АДПРАВІЦЦА Ў ВАТЫКАН З ВІЗІТАМ “AD LIMINA APOSTOLORUM”



Епіскапат Беларусі ў поўным складзе адправіцца ў Ватыкан з візітам “ad limina Apostolorum”. На працягу першага тыдня лютага 2018 г. біскупы наведаюць ватыканскія дыкастэрыі і падзеляцца з іх прадстаўнікамі інфармацыяй аб жыцці Касцёла ў краіне, будуць цэлебраваць святыя Імшы ў чатырох вялікіх рымскіх базыліках: св. Пятра, св. Паўла за мурамі, св. Яна на Латэране і святой Марыі Вялікай (Санта-Марыя-Маджорэ).

Кульмінацыйным момантам візіту стане сустрэча са Святым Айцом Францішкам. З 2017 г. падчас “ad limina” няма сустрэч Папы з асобнымі біскупамі і яго афіцыйных прамоў. Пантыфік прымае епіскапат у поўным складзе і размаўляе з іерархамі спантанна за зачыненымі дзвярыма.

Старшыня Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч прызнаўся, што падчас чацвёртага для беларускага епіскапату “ad limina Apostolorum” будуць уздымацца сапраўды важныя пытанні. “Кожны такога роду візіт – гэта своеасаблівая справаздача за мінулы перыяд жыцця Касцёла. Ёсць праграма. Ёсць пытанні, на якія трэба адказаць. Кожная дыяцэзія робіць гэта. Гэта каля 80 старонак. Апрача гэтага, ужо на месцы, вызначаны біскуп робіць справаздачу падчас візітаў у ватыканскіх дыкастэрыях. Мне, напрыклад, даручылі зрабіць гэта ў Кангрэгацыі каталіцкай адукацыі. Гэта вялікая праца, якую самому выканаць немагчыма. Над гэтым працавалі шматлікія святары, кожны ў сваёй галіне, бо тут і сям’я, і экуменізм, і міжрэлігійны дыялог, і духавенства, і кансэкраваныя асобы”, – сказаў іерарх Беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё.

Паводле традыцыі, у межах візіту “ad limina Apostolorum” біскупы з усяго свету прыбываюць у Рым. Раней гэта адбывалася кожныя пяць гадоў, падчас апошніх пантыфікатаў радзей.

Арцыбіскуп Кандрусевіч лічыць, што такія візіты – гэта магчымасць упарадкаваць некаторыя справы ў дыяцэзіях і епіскапаце. “Гэта добры знак, бо можа штосьці там было недароблена, можа, змянілася сітуацыя ў нейкай камісіі епіскапату і трэба змяніць яе членаў. Усё гэта прыводзіцца ў парадак. Я б параўнаў гэта з рахункам сумлення перад споведдзю”, – сказаў іерарх.

Мітрапаліт прызнаўся, што падчас сустрэч, у тым ліку з Пантыфікам, будзе закранацца пытанне падрыхтоўкі дамовы беларускай дзяржавай. “Нам трэба прадставіць свой Касцёл: хто мы такія, адкуль прыбылі, як мы жывём, якія праблемы існуюць? Мы кажам адкрыта аб нашых праблемах. Напрыклад, тое ж пытанне падпісання канкардату або пагаднення паміж Канферэнцыяй Біскупаў і дзяржавай. Мы кажам таксама, якімі праблемамі жыве беларускі народ, якія выклікі існуюць у нас. У Ватыкане павінны ведаць аб гэтым, і не толькі з нейкіх навін, а з першых рук. Нам важна пачуць меркаванне Папы адносна вырашэння гэтых праблем – асабісты кантакт з ім незвычайна каштоўны для нас”, – паведаміў арцыбіскуп Кандрусевіч.

Папярэдні візіт “ad limina Apostolorum” Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі адбыўся восем гадоў таму, 11-17 снежня 2009 г.

*Паводле Беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# ПАПА ФРАНЦІШАК УНЁС ПАПРАЎКІ Ў КОДЭКС КАНАНІЧНАГА ПРАВА




Абнародавана апостальскае пасланне motu proprio папы Францішка «Magnum principium», якое ўносіць некаторыя папраўкі ў 838-ы канон Кодэкса кананічнага права. Гэты канон вызначае паўнамоцтвы адносна перакладаў літургічных тэкстаў.

Тлумачачы прычыны, якія прывялі да гэтых зменаў, Святы Айцец нагадвае пра абавязак біскупаў рыхтаваць і ўхваляць пераклады літургічных кніг. Пасля Другога Ватыканскага Сабору лацінскі Касцёл усведамляў, з якой ахвярай звязана ўвядзенне сучасных моў у літургію пасля стогадовай традыцыі выкарыстання лацінскай мовы ва ўсіх лакальных Касцёлах.

Ад часоў Сабору Апостальскі Пасад выдаваў шматлікія кіраўніцтвы, дапаможнікі, пасланні, зацвярджаў літургічныя кнігі. Усе ўказанні, якія ўнесены ў іх, былі і застаюцца крытэрыем для дзейнасці літургічных камісій.

Мэта перакладу літургічных і біблейскіх тэкстаў, якія выкарыстоўваюцца ў літургіі, – піша папа Францішак, – заключаецца ў тым, каб «абвяшчаць вернікам слова збаўлення ў паслухмянасці веры». «Гэтая мэта патрабуе дакладнага перадавання вызначанаму народу праз яго мову таго, што Касцёл імкнуўся перадаць іншаму народу праз лацінскую мову», – адзначае Пантыфік у тэксце motu proprio.

Папа Францішак нагадвае, што паміж біскупскімі канферэнцыямі і Кангрэгацыяй Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў павінна быць «пастаяннае супрацоўніцтва і цалкам узаемны, пільны і крэатыўны давер». З гэтай нагоды Пантыфік пажадаў унесці некаторую яснасць у прынцыпы, выкладзеныя яшчэ Другім Ватыканскім Саборам, каб садзейнічаць плённаму супрацоўніцтву паміж Апостальскім Пасадам і біскупамі.

Святы Айцец уносіць некалькі паправак у канон 838 Кодэкса кананічнага права, які датычыць перакладу літургічных тэкстаў на мовы свету. Параграф 2 гэтага канона ў актуальным на сёння кодэксе кажа, што ў правамоцтвы Апостальскага Пасаду ўваходзіць «кіраўніцтва святой літургіяй ва ўсім Касцёле, выданне літургічных кніг і разгляд іх перакладаў на сучасныя мовы, а таксама нагляд за тым, каб літургічныя правілы слушна захоўваліся паўсюль». Папраўка да гэтага параграфа кажа, што ў правамоцтвы Апостальскага Пасаду ўваходзіць «кіраўніцтва святой літургіяй ва ўсім Касцёле, выданне літургічных кніг, разгляд перапрацовак, ухваленых паводле нормаў права біскупскімі канферэнцыямі, а таксама нагляд за тым, каб літургічныя правілы слушна захоўваліся паўсюль».

Паводле актуальнай на сёння версіі 3 параграфа 838 канона, «задача канферэнцыі біскупаў – рыхтаваць пераклады літургічных кніг на сучасныя мовы, выконваючы іх належную апрацоўку ў межах, вызначаных у саміх літургічных кнігах, а таксама выдаваць іх пасля папярэдняга зацвярджэння Святым Пасадам». З улікам папраўкі ў гэтым параграфе цяпер гаворыцца: «Задача канферэнцыі біскупаў – рыхтаваць пераклады літургічных кніг на сучасныя мовы, выконваючы іх належную апрацоўку ў вызначаных межах, ухваляць і выдаваць літургічныя кнігі для рэгіёнаў, якія адносяцца да іх, пасля зацвярджэння Апостальскім Пасадам».

Да папраўкі ў другі параграф дадаецца ўдакладненне, што слова recognitio, якое ў актуальнай на сёння італьянскай версіі Кодэкса кананічнага права перакладаецца тэрмінам autorizzare («дазваляць», «зацвярджаць»), не адпавядае значэнню гэтага слова. У тлумачэнні Папскай рады па перакладу заканадаўчых тэкстаў адзначаецца, што тут гаворка ідзе не пра ўхваленне або дазвол, а «пра даследаванне, уважлівы і падрабязны разгляд».

Папраўкі ў Кодэкс кананічнага права ўступяць у сілу 1 кастрычніка.

*Паводле Беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё.*

# ВІНШУЕМ МАЛАДЫХ

**Давяраем добраму Богу сужэнскае жыццё маладых людзей, якія вырашылі быць заўсёды разам, і просім для іх асаблівага Божага благаслаўлення**



Аляксандра Ародзя і Ірыну Капітонаву
Гійоа Лове і Кацярыну Лове (Карпаву)
Аляксандра Савіцкага і Вераніку Савіцкую

Антона Асоўскага і Юлію Бурко
Міхаіла Слабашэвіча і Таццяну Лабука
Рычарда Лушко і Кацярыну Мякенькую

Міхаіла Штура і Ксенію Сяргееву
Арцёма Марочка і Анастасію Даргель
Уладзіслава Шапялевіча і Варвару Ратнікаву

Сяргея Глушчанка і Марыю Гарудка
Дзмітрыя Мінчанка і Клаўдзію-Расон Мінчанка-Вейсага
Дзяніса Штуро і Кацярыну Скалабан

Станіслава Філатава і Ангеліну Вараб'ёву
Юрыя Гатоўчыка і Валерыю Семянюк
Андрэя Спрытула і Вераніку Забрамскую

Дзмітрыя Мысліўчыка і Марыю Лабачэўскую
Сяргея Законнікава і Лілію Законнікаву
Міхаіла-Яна Гілевіча і Кацярыну-Яну Гілевіч
Ілью Кузьміча і Наталлю Пятровіч

## З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:

***Уладыслаў Чэрнік***, сын Віталія і Святланы
***Дзіяна Аляксеенка***, дачка Антонія і Наталлі
***Аляксандра Тарабеж***, дачка Дзмітрыя і Веранікі
***Аляксандр Палітыкін***, сын Дзмітрыя і Ганны
***Кіра Горбач***, дачка Андрэя і Марыны
***Давід Лосеў***, сын Максіма і Анастасіі
***Ізабэлла Кардэнас Васкес***, дачка Грэгорыо і Таццяны
***Дзяніс Стэрс***, сын Арцёма і Юліі
***Тамаш Дземчык***, сын Вадзіма і Марыі
***Вераніка Трубіш***, дачка Дзмітрыя і Валянціны
***Таццяна-Марыя Шышкавец***, дачка Аляксандра і Ірыны
***Цімафей Міхін***, сын Аляксандра і Яўгеніі
***Эмілія Янсоне***, дачка Марцінса і Наталлі
***Ульяна-Марыя Фралова***, дачка Аляксея і Вольгі

***Раман Краснік***, сын Віктара і Аксаны
***Арына-Ірына Хмялеўская***, дачка Уладзіслава і Вікторыі
***Марына Фралова***, дачка Яўгена і Кацярыны
***Герман Макарэвіч***, сын Канстанціна і Вольгі
***Марта Макарэвіч***, дачка Канстанціна і Вольгі
***Мар'яна Красоўская***, дачка Ігара і Тамары
***Паліна-Кацярына Цэхановіч***, дачка Руслана і Алены
***Глеб Раманаў***, сын Паўла і Таццяны
***Мікіта-Мацвей Казлоўскі***, сын Яўгена і Наталлі
***Арцём Сушчэўскі***, сын Андрэя і Вольгі
***Мілана-Марыя Магдалена Яроменка***, дачка Пауло і Кацярыны
***Ян Сёмчык***, сын Андрэя і Таццяны
***Раман Антоні Кулеш***, сын Андрэя і Іны



***Ніна Курдзека***, дакча Дзяніса і Яны
***Ганна-Марыя Жаўсткевіч***, дачка Аляксандра і Галіны
***Любоў Гайдукевіч***, дачка Віталія і Наталлі
***Караліна Баркоўская***, дачка Уладзіміра і Гражыны
***Арсеній Дагіль***, сын Дзяніса і Веранікі
***Марк Карнеевіч***, сын Сяргея і Марыны
***Глеб-Платон Гарбачоў***, сын Аляксандра і Алесі
***Макар Горбач***, сын Андрэя і Ганны
***Софія Ціхановіч***, дачка Дзмітрыя і Ірыны
***Сафія Багданкевіч***, дачка Эдуарда і Юліі
***Вікторыя-Марыя Хацько***, дачка Максіма і Анастасіі
***Яўгеній Юроіць***, сын Юрыя і Алены
***Агата Мігун***, дачка Яўгена і Людмілы
***Ніколь-Вераніка Назарава***, дачка Руслана і Ангеліны
***Амелія Паўлава***, дачка Максіма і Ганны
***Іван Зяноўчык***, сын Дзмітрыя і Анны
***Захар Каваленка***, сын Сяргея і Наталлі
***Яна Рацько***, дачка Арцёма і Ганны
***Раман Бароўскі***, сын Андрэя і Вольгі
***Мацвей Масквіцін***, сын Алегы і Ганны

***Міхаіл Паўлаў***, сын Андрэя і Паліны
***Міланія Курчэўская***, дачка Віталія і Алены
***Валерыя Палубенка***, дакча Глеба і Юліі
***Арына-Марыя Маркушэўская***, дачка Дзмітрыя і Наталлі
***Аліса-Яна Мішкавец***, дачка Юрыя і Ганны
***Дзямід-Антоній Каражан***, сын Барыса і Юліі
***Іван-Ян Голубеў***, сын Паўла і Веранікі
***Ганна Лаппо***, дачка Міхаіла і Вікторыі
***Сяргей Законнікаў***, сын Івана і Валянціны
***Лілія Законнікава***, дачка Рыгора і Валянціны
***Кацярына-Яна Ацюцкая***, дачка Ігара і Ірыны
***Дамініка Грынман***, дачка Яна і Анастасіі
***Сабіна Фідрык***, дачка Генадзія і Юліі
***Пётр-Міхаіл Садоўскі,*** сын Арцёма і Наталлі
***Ігнат-Феліцыян Сацукевіч***, сын Івана і Вольгі
***Элеанора -Вераніка Логвінава***, дачка Андрэя і Арыны
***Іван-Павел Навасёлаў***, сын Дзяніса і Ірыны

## СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА

_______ . _______ *2017 г. у* _______ . _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________________

________________________________________________________

| 23 кастрычніка<br>Панядзелак | 24 кастрычніка<br>Аўторак | 25 кастрычніка<br>Серада | 26 кастрычніка<br>Чацвер | 27 кастрычніка<br>Пятніца | 28 кастрычніка<br>Субота | 29 кастрычніка<br>Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 8.00 – ✞ | 8.00 – * |
| 9.00 – *PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – * | 9.00 – * | 9.00 – * |
| 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 12.00 – ✞ | 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 12.00 – ✞ | 11.00 – S |
| 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 13.00 – *PL |
| 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 15.00 – 👪 |
| 19.00 – ✞ | 19.00 – * | 19.00 – * | 19.00 – * | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 15.00 – Вяч PL |
| | | | | | | 16.00 – * |
| | | | | | | 17.00 – * |
| | | | | | | 19.00 – * |
| | | | | | | 21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым благаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** – у капліцы Маці Божай Будслаўскай
**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## РАСКЛАД НАЧНЫХ ЧУВАННЯЎ У ЧЫРВОНЫМ КАСЦЁЛЕ НА 2017-2018 гг.



У парафіі Св. Сымона і Св. Алены (Чырвоны касцёл) ад кастрычніка да мая кожную першую суботу месяца будуць праходзіць начныя чуванні, прысвечаныя перапрашэнню Найсвяцейшага Сэрца Езуса і Беззаганнага Сэрца Марыі.

**Расклад чуванняў на 2017 год:**
6-7 кастрычніка
3-4 лістапада
1-2 снежня

**Расклад чуванняў на 2018 год:**
5-6 студзеня
2-3 лютага
2-3 сакавіка
6-7 красавіка
4-5 мая

**Праграма чування:**

23.00 – святая Імша ў інтэнцыі перапрашэння Найсвяцейшага Сэрца Езуса

24.00–05.30 – адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту, Ружанец, Крыжовы шлях, іншыя малітвы

06.00 – святая Імша ў інтэнцыі перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі.

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе жадаючыя, асабліва тыя вернікі, хто належыць да малітоўных рухаў і супольнасцяў. Будзе таксама магчымасць прыступіць да сакрамэнту споведзі.

*Паводле Catholic.by*

Голас душы № 9-10 (544) 2017. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб’яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 19.10.2017. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф. 23, 220033 г. Мінск.